# Фарміраванне рэгулятыўных вучэбных дзеянняў на ўроках беларускай мовы



**А. У. ДАНІЧ,**
загадчык кафедры дашкольнай
і пачатковай адукацыі
ВДУ імя П. М. Машэрава,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Напрамак развіцця сучаснай сусветнай і, адпаведна, айчыннай адукацыі канцэнтруе ўвагу педагогаў-тэарэтыкаў і педагогаў-практыкаў на асобе вучня. Менавіта ён з аб'екта навучання пераўтвараецца ў суб'ект адукацыйнага працэсу. Гэта прыводзіць да таго, што галоўнай мэтай сучаснай школы з'яўляецца стварэнне ўмоў для дасягнення школьнікамі не столькі прадметных, колькі асобасных вынікаў вучэбнай дзейнасці. Навучэнец павінен умець адаптавацца да ўмоў соцыуму, самастойна набываць веды, прагназаваць свае дзеянні, ставіць мэты і кантраляваць уласную дзейнасць. Гэта жыццёва неабходна ў нашай дынамічнай рэчаіснасці.

Вельмі важна не проста валодаць некалі засвоенымі ведамі, а своечасова і ўмела імі карыстацца, праяўляючы свае функцыянальныя якасці. Безумоўна, асновай для дасягнення гэтага з'яўляецца найважнейшае ўменне вучыцца, якое дазволіць школьніку максімальна эфектыўна засвойваць неабходныя прадметныя веды і авалодваць шэрагам разнастайных кампетэнцый. Уменне вучыцца прадугледжвае фарміраванне ўсіх кампанентаў вучэбнай дзейнасці, сярод якіх пазнавальная і вучэбная матывацыя, вучэбныя задачы, вучэбныя дзеянні, дзеянні кантролю (які пры неабходнасці пераходзіць у самакантроль) і ацэнкі (пры неабходнасці — самаацэнкі).

Сродкам авалодвання пазначанымі кампанентамі, як паказвае аналіз сучасных навукова-даследчых і метадычных крыніц, з'яўляюцца ўніверсальныя вучэбныя дзеянні. Згодна з канцэпцыяй развіцця ўніверсальных вучэбных дзеянняў (УВД), распрацаванай шэрагам навукоўцаў пад кіраўніцтвам А. Р. Асмолава, кожная вучэбная дысцыпліна мае патэнцыяльную магчымасць для фарміравання і развіцця УВД. Патэнцыял менавіта моўных прадметаў, у нашым выпадку беларускай мовы, у пазначаным кантэксце на парадак вышэйшы. Гэта тлумачыцца тым, што мова — не толькі вучэбны прадмет, але, што прынцыпова, сродак навучання. Пры арганізацыі практычнай дзейнасці педагога, які імкнецца эфектыўна вырашыць задачу фарміравання прадугледжаных вучэбнай праграмай па прадмеце “Беларуская мова” асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый, мы прапануем максімальна рэалізаваць навучальны патэнцыял гэтай дысцыпліны, а дакладней, яе сродак — звязны тэкст. Зыходзячы з гэтага, сам працэс кантролю над сфарміраванасцю УВД як сродку і крытэрыю дасягнення вынікаў вучэбнай дзейнасці мэтазгодна арганізаваць на аснове шматаспектнай работы навучэнца над тэкстамі, рознымі па змесце, жанрах, стылях і тыпах мовы і інш.

У межах дадзенага даследавання мы канцэнтруем сваю ўвагу на фарміраванні ў малодшых школьнікаў менавіта рэгулятыўных вучэбных дзеянняў, якія з'яўляюцца найважнейшай часткай працэсу адукацыі, таму што забяспечваюць навучэнцаў такімі ўменнямі, як самастойная пастаноўка мэты, праектаванне і шляхі яе рэалізацыі, кантроль і ацэнка ўласных дасягненняў. Разуменне сутнасці рэгулятыўных дзеянняў можна звесці да наступнага: гэта такія агульнавучэбныя ўменні, якія забяспечваюць планаванне, арганізацыю, кантроль, рэгуляванне і аналіз уласнай вучэбнай дзейнасці навучэнцамі [2]. Згодна са зместам Адукацыйнага стандарту I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, валоданне пазначанымі ўменнямі з'яўляецца паказчыкам дасягнення метапрадметных вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі [5].

Галоўнай асаблівасцю псіхічнага развіцця вучняў малодшага школьнага ўзросту з'яўляецца фарміраванне адвольнасці, якая праяўляецца ў характары працэсаў мыслення, увагі, памяці, здольнасці суадносіць сваю дзейнасць з вызначанай мэтай і інш. Самастойнае вызначэнне мэты і задач для яе дасягнення, будаванне алгарытму дзеянняў, кантроль над рашэннем задач, ацэнка вынікаў, валявое пераадоленне перашкод — гэта прыкметы адвольнай дзейнасці, якая "перарасла" ў паводзіны [4] і яе можна лічыць комплексам кантралюючых сродкаў. Дадзены комплекс складаецца з наступных кампанетаў: мэтавызначэння, планавання, прагназавання, кантролю, карэкцыі, ацэнкі, валявой самарэгуляцыі.

*Мэтавызначэнне* складаецца з фармулявання мэты, аналізу і выбару максімальна адэкватных сродкаў для яе дасягнення, пераадолення перашкод, непасрэдна дасягнення мэты і яе практычнай рэалізацыі [3].

*Планаванне* прадугледжвае складанне плана дзейнасці з чарговасцю дзеянняў і вызначэннем прамежкавых мэт, суаднясенне ўласных дзеянняў з мэтай. Да навыкаў планавання можна аднесці фармуляванне мэты дзейнасці, здольнасць выбраць найбольш эфектыўныя сродкі для яе дасягнення, пабудову алгарытму дзеянняў, аналіз самога працэсу планавання.

*Прагназаванне* — прадбачанне выніку дзейнасці, узроўню, якасці і характарыстык атрыманых ведаў, навыкаў.

*Кантроль* зводзіцца да параўнання выніку дзейнасці з узорам. Галоўнае — знайсці адрозненні ці памылкі. "Інструментальнай" характарыстыкай кантролю з'яўляецца неабходнасць суаднесці, падпарадкаваць уласную дзейнасць патрабаванням вучэбнай задачы. Ажыццяўляючы кантраляванне, навучэнцы могуць мяняць паслядоўнасць дзеянняў, скарачаць іх, суадносіць з умовамі задачы і жаданымі характарыстыкамі выніку. Можна сказаць, што кантроль забяспечвае правільнасць дасягнення выніку.

*Карэкцыя*, якая з'яўляецца абавязковай часткай кантролю, пры ўмове несупадзення выніку/прамежкавага выніку з узорам, прадугледжвае рэдагаванне як плана, так і спосабаў яго рэалізацыі. Трэба памятаць, што менавіта карэкцыя характарызуе індывідуальныя, асобасныя праявы змянення паводзін школьніка, спосабаў дзейнасці, нават мэты, калі мяняецца сітуацыя. Карэкцыя як вынік кантролю/самакантролю патрабуе і валявой рэгуляцыі.

*Ацэнка* — гэта аналіз суаднясення мэты і выніку, параўнанне таго, што ўжо вядома, з новымі ведамі, іх якаснымі і колькаснымі характарыстыкамі. Галоўная мэта ацэнкі — вызначэнне навучэнцамі ступені засваення спосабу дзеяння і ўжывання таго, які быў паспяхова засвоены. Зразумела, што пералічаныя кампаненты адвольнай рэгулятыўнай сферы школьнікаў фарміруюцца і праяўляюцца ў сукупнасці і з'яўляюцца вельмі эфектыўным сродкам ажыццяўлення самастойнай вучэбнай дзейнасці [7]. Можна сцвярджаць, што адвольнасць паводзін з'яўляецца каштоўным і пажаданым наватварэннем, характэрным для малодшых школьнікаў.

Працэс фарміравання і далейшага развіцця рэгулятыўных дзеянняў грунтуецца на валявых дзеяннях, якія патрабуюць пераадолення знешніх і ўнутраных перашкод, і спрыяе развіццю пэўных асобасных якасцей навучэнцаў: самастойнасці, вытрымкі, актыўнасці, мэтанакіраванасці, арганізаванасці, адказнасці, ініцыятыўнасці. На развіццё валявых якасцей уплываюць пачуцці калектывізму, патрыятызму, доўгу і інш.[7], а валявыя рысы ўплываюць на мысленне, паводзіны і камунікацыю школьнікаў, у выніку чаго працэс навучання становіцца для іх асэнсаваным, самастойным і кіруемым.

Безумоўна, працэс фарміравання рэгулятыўных дзеянняў вельмі доўгі, складаны і недастаткова кантралюемы, бо носіць ярка выражаны суб'ектыўны характар. Але правільна арганізаваная педагогам вучэбная дзейнасць, увага да кожнага вучня, улік яго інтэлектуальных і эмацыянальна-валявых асаблівасцей абавязкова праявіцца ў самастойнасці, адказнасці, зацікаўленасці, наогул, у паспяховасці вучэбнай дзейнасці.

Для фарміравання рэгулятыўнага вучэбнага дзеяння, планавання ўласнай вучэбнай дзейнасці можна скарыстаць наступныя эфектыўныя прыёмы:

- абмеркаванне гатовага плана рашэння вучэбнай задачы;
- работа з дэфармаваным планам рашэння вучэбнай задачы;
- выкарыстанне плана з лішнімі дадзенымі ці дадзенымі, якіх не хапае;
- складанне ўласнага плана рашэння вучэбнай задачы.

Пры рабоце з планам можна: адзначаць выкананае, удакладняць, уносіць змены, вызначаць і ацэньваць прамежкавыя вынікі, абмяркоўваць розныя пункты гледжання і інш. Можна скарыстаць просты план, план-схему, план-канспект, арыентуючыся на мэту ўрока і яго задачы. Выконваючы такія заданні, школьнікі вучацца планаваць свае дзеянні і іх вынікі, а таксама знаходзіць крытэрыі, пры дапамозе якіх можна ацаніць як сваю работу, так і работу іншых.

Галоўная задача кантролю і ацэнкі — навучыць школьнікаў самастойна ацэньваць уласную работу. Для гэтага трэба растлумачыць вучням, што і навошта ацэньваць, якія формы ацэнак існуюць. Адзначаць належыць кожны поспех навучэнца, станоўчыя змены не ў параўнанні з дзейнасцю аднакласнікаў, а ў параўнанні яго ўласных набыткаў з папярэднімі ведамі і ўменнямі. Вельмі каштоўнай з'яўляецца самаацэнка, калі школьнік прымае ўдзел у выпрацоўцы падстаў і крытэрыяў для ацэньвання. Настаўнік дапамагае і накіроўвае ацэначную дзейнасць, аднак ініцыятыўнасць вучняў абавязковая.

Можна вызначыць шэраг патрабаванняў да фарміравання ацэначнай і кантралюючай дзейнасці малодшых школьнікаў:

- кантроль і ацэнка павінны быць суадноснымі з мэтамі і задачамі навучання;
- ацэнцы належаць уласныя дасягненні навучэнца без параўнання з іншымі;
- кантроль і ацэнка павінны насіць пераважна працэсуальны, а не выніковы характар;
- перавага павінна надавацца самаацэнцы і самакантролю, а не кантролю з боку настаўніка;
- кантроль і ацэнка павінны стаць для вучня асэнсаваным дзеяннем.

Эфектыўныя прыёмы кантролю і ацэнкі:

- лесвічка (ад нізу лесвічкі (дрэнна вывучыў/зрабіў) да верху (добра вывучыў/зрабіў));
- смайлікі (ад усмешкі да грымасы);
- святлафор (чырвоны — дрэнна, трэба дапамога, жоўты — крыху няўпэўнены, зялёны — добра ведаю сам);
- партфоліа — вельмі папулярны інструмент самаацэнкі, яго прызначэнне — дэманстрацыя максімальнага аб'ёму ўласных поспехаў, якія можна не толькі ацаніць і паказаць іншым, але і на іх аснове спланаваць наступныя дасягненні.

Для фарміравання ўмення планавання, ацэнкі і кантролю метадысты прапануюць актыўна ўжываць прыём вучэбнага мадэлявання, які дазваляе вучыць працаваць з рознымі відамі прадстаўлення інфармацыі і яе пераўтварэння: схемамі, табліцамі, графікамі, дыяграмамі, сімваламі, малюнкамі. Педагог дапамагае навучэнцам выпрацоўваць крытэрыі, па якіх можна праводзіць самаправерку і ацэнку. Такім чынам фарміруецца вельмі важнае УВД — уменне карэкціраваць план, спосаб дзеяння, алгарытм выканання.

Пэўную цяжкасць выклікае фарміраванне ўмення ацэньваць уласныя вынікі і вынікі іншых. Трэба ўлічваць наступнае:

- да пачатку дзейнасці паведаміць аб неабходнасці ацаніць вынікі;
- прадметам ацэньвання з'яўляюцца дзеянні, вынікі, уласныя магчымасці і інш.;
- неабходна забяспечыць аб'ектыўнасць ацэнкі пры дапамозе параўнання папярэдніх і наступных дасягненняў;
- павінна быць устаноўка на паспяховасць дзейнасці (стварэнне "сітуацыі поспеху");
- абавязковае супрацоўніцтва навучэнца і настаўніка на аснове даверу, павагі, эмпатыі.

Абавязковай фінальнай часткай работы па фарміраванні рэгулятыўных вучэбных дзеянняў з'яўляецца рэфлексія, якая патрабуе ад навучэнца аналізу выніку рашэння задачы, суаднясення мэты і выніку, ацэнкі настаўніка і самаацэнкі, ацэнкі ўзроўню ўласных поспехаў. Можна пачынаць з выразаў: "Я змог...", "Я навучыўся...", "Я даведаўся...". Рэфлексія стварае ўмовы навучэнцам для вылучэння асноўных элементаў дзейнасці: мэты, сэнсу, спосабаў, вынікаў. Гэта таксама вельмі важна для фарміравання асобасных якасцей малодшых школьнікаў: самастойнасці, актыўнасці, працавітасці, мэтанакіраванасці.

Праілюструем фарміраванне асноўных рэгулятыўных уменняў у сукупнасці з іншымі УВД у некаторых адпаведных заданнях, якія можна прапанаваць навучэнцам пры рабоце над звязным тэкстам.

**Тэмы "Тэкст", "Сказ"**

**Яблык**

Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Вялікі, з залацістымі бакамі і празрысты. Нават зярняткі відаць.

Пакруціў дзед у руцэ яблык, хацеў з'есці, ды перадумаў.

— Занясу дадому. Дзяцей пачастую.

Дома дзед аддаў яблык унучцы Ніне.

— Ой, які яблык вялікі! — усклікнула Ніна.

І толькі яна хацела адкусіць, як прыйшла з работы маці.

— Мамачка, — сказала Ніна. — Ты стамілася. Вазьмі, з'еш яблык. Я частую цябе.

Маці падзякавала Ніне, узяла яблык, палюбавалася ім.

— Я Міхаську пачастую. Ён жа ў нас самы маленькі, — сказала маці. І, калі Міхаська вярнуўся з дзіцячага сада, аддала яблык яму.

Міхаська нават ножкамі затупаў ад радасці, такі яблык яму далі — вялікі, залацісты, прыгожы!

Ён дастаў са скрынкі ножык, паглядзеў на дзеда, маму, Ніну і разрэзаў яблык на чатыры часткі.

— Гэта, дзядуля, табе, гэта маме, а гэта мне і Ніне, — падзяліў ён. — Ешце, калі ласка. Я частую.

Смачны быў яблык. Салодкі, сакавіты. Усе елі, хвалілі Міхаську. А больш за ўсіх хваліў дзядуля [9, с. 24].

Рэгулятыўныя ўніверсальныя вучэбныя дзеянні можна фарміраваць, выконваючы наступныя заданні:

**Заданне 1.** Сфармулюйце асноўныя правілы пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі пры дапамозе дадзеных схем і адпаведных прыкладаў з тэксту. Адказ запішыце.

1. ◯, ◯, ды ◯
2. ◯, ◯ і ◯
3. ◯, ◯, ◯
4. ◯, ◯

Для выканання такога задання навучэнец павінен скласці план дзеяння: яшчэ раз прачытаць тэкст, звяртаючы ўвагу на наяўнасць аднародных членаў (першы прамежкавы вынік), потым знайсці сказы, будова якіх адпавядае схемам (другі прамежкавы вынік), зрабіць вывады аб пастаноўцы знакаў прыпынку па кожнай з чатырох прапанаваных схем і суадносных сказах (фармуляванне правілаў як вынік рашэння вучэбнай задачы).

Можна прапанаваць запісаць план дзеяння і абмеркаваць пункты плана і іх паслядоўнасць. Калі ўскладніць задачу і дабавіць, напрыклад, схему, да якой няма адпаведнага сказа, то план навучэнцу трэба карэкціраваць, бо не хапае дадзеных для дасягнення прамежкавых вынікаў.

Кантроль і ацэнку выканання такога задання можна праводзіць як пасля дасягнення прамежкавых вынікаў, так і пасля выканання ўсяго задання. Крытэрыямі ацэнкі можна лічыць ступень выканання задання: усталявана адпаведнасць паміж схемамі і сказамі, фармулёўкі правілаў адпавядаюць прыкладам. У дадзеным выпадку будзе эфектыўным скарыстаць смайлікі ці іншыя сімвалы для ацэньвання прамежкавых і канчатковых вынікаў.

Рэфлексія будзе патрабаваць аналізу дапушчаных памылак (калі яны ёсць), якія знойдзены самастойна ці настаўнікам, і адказаў на пытанні: "Што я зрабіў?", "Як зрабіў?" і "Чаму не зрабіў?".

Трэба адзначыць, што выкананне задання патрабуе ад навучэнца такіх даволі складаных дзеянняў, як інтэрпрэтацыя і інтэграцыя інфармацыі, якая прадстаўлена невідавочна, суаднясенне тэкставай інфармацыі і схематычнай, фармуляванне звязнага выказвання на аснове самастойна знойдзеных доказаў. Паспяховае выкананне такіх заданняў сведчыць аб сфарміраванасці прадуктыўнага тыпу вучэбнай дзейнасці.

**Заданне 2.** Паспрабуйце пры дапамозе стрэлак адлюстраваць суадносінасць малюнкаў з падзеямі ў тэксце.



Выкананне гэтага задання патрабуе ад навучэнца вызначэння этапаў рашэння вучэбнай задачы, г. зн. складання плана дзейнасці: на аснове аналізу зместу тэксту вызначыць суадносінасць кожнага з малюнкаў з адпаведнай часткай тэксту (4 прамежкавыя этапы), скласці схему суадносінасці. Абавязкова прагаварыць паслядоўнасць дзеянняў ці запісаць пункты плана. Настаўнік можа прапанаваць частку плана, каб навучэнец змог яго дапоўніць. Эфектыўна таксама дэфармаваць план, які прапануецца вучню, ці ўнесці лішнія пункты, напрыклад: знайсці знешнюю адпаведнасць людзей на малюнках і ў тэксце. Такі прыём робіць планаванне больш асэнсаваным і паслядоўным.

Кантраляванне і ацэньванне такога задання можна праводзіць як пасля выканання ўсяго задання, так і яго прамежкавых вынікаў. Крытэрыі ацэнкі — правільнасць выканання задання, а ў якасці ацэнкі можна ўжываць умоўныя значкі ці іншыя сродкі (можна, напрыклад, прымяніць ацэнку ў балах). Рэфлексія з'яўляецца вельмі важным элементам работы.

Выкананне такіх заданняў патрабуе ад навучэнца валодання дзеяннямі пошуку спосабу і алгарытму рашэння пастаўленай задачы, інтэрпрэтацыі і інтэгравання інфармацыі, якая прадстаўлена невідавочна, суаднясення тэкставай інфармацыі з візуальнай, прадстаўленай у выглядзе малюнка ці схемы.

Каштоўнымі для выхавання станоўчых маральных якасцей, якія непарыўна звязаны з фарміраваннем рэгулятыўных дзеянняў, можна лічыць заданні наступнага тыпу.

**Заданне 3.** Выберыце з прапанаванага пераліку станоўчыя якасці, агульныя для членаў гэтай сям'і і вашай уласнай. Адказ запішыце.

*Дабрыня, працавітасць, сціпласць, шчодрасць, павага да старэйшых, гасціннасць, клапатлівасць, ашчаднасць, адукаванасць.*

Такія заданні, акрамя пазначаных вышэй рэгулятыўных дзеянняў (у дадзеным выпадку планавання, карэкцыі, кантролю і ацэньвання), ствараюць умовы для асэнсавання навучэнцамі ўласных маральных нормаў, патрабуюць аналізу свайго асяроддзя і месца ў ім, параўнання з пэўнымі эталонамі і прыкладамі. Рэфлексія і ацэнка выканання такіх заданняў могуць супадаць, таму што маюць падкрэслены асобасны характар. Яны таксама патрабуюць універсальных дзеянняў аналізу зместу тэксту, суаднясення атрыманай інфармацыі з уласным вопытам і маральнымі нормамі.

Безумоўна, суаднесці пытанне ці заданне з пэўным рэгулятыўным дзеяннем вельмі цяжка, таму што вучэбнае дзеянне мае комплексны характар. Абавязковым кампанентам прапанаваных намі заданняў з'яўляецца фарміраванне і ацэнка тых прадметных уменняў, якія прадугледжаны дзеючай вучэбнай праграмай па прадмеце "Беларуская мова".

Комплексную работу па фарміраванні і развіцці ўніверсальных вучэбных дзеянняў мэтазгодна ажыццяўляць на тэкставай аснове. Прапануем скарыстаць тэксты розных стыляў (мастацкага, навуковага, у тым ліку навукова-папулярнага) і тыпаў (тэксты-апавяданні, тэксты-разважанні, тэксты-апісанні). Крытэрыямі выбару тэкстаў для работы з'яўляецца іх мастацкая каштоўнасць, інфарматыўнасць, адпаведнасць зместу, жыццёваму вопыту дзяцей і іх узроставым асаблівасцям, а таксама даступнасць.

У тэкстах прадстаўлены розныя сітуацыі: вучэбныя, адкуль навучэнцы могуць узяць інфармацыю для рашэння як вучэбна-практычных, так і вучэбна-даследчых задач; грамадскія, якія змяшчаюць інфармацыю аб прыродзе роднага краю, яе гісторыі і гісторыі іншых краін; асобасныя, дзе адлюстроўваюцца маральныя аспекты, актуальныя для малодшых школьнікаў.

Дыягностыку сфарміраванасці рэгулятыўных універсальных вучэбных дзеянняў праводзіць вельмі цяжка. Паказчыкам сфарміраванасці такіх дзеянняў лічыцца ўзровень рэгулятыўных дзеянняў (высокі, сярэдні, нізкі), абумоўленых ступенню самастойнасці пры рашэнні задач, пры складанні плана дзеянняў, у пошуку і адборы неабходнай інфармацыі, праяўленні валявой самарэгуляцыі і інш. [7]. Як сведчаць даследаванні, малодшым школьнікам уласцівы сярэдні ўзровень сфарміраванасці рэгулятыўных дзеянняў [6]. Павысіць яго магчыма пры мэтанакіраваным уздзеянні на якасць асэнсаванасці дзеянняў самакантролю. Даследчыкі вызначаюць наступныя кампаненты для фарміравання самарэгуляцыі: станоўчую матывацыю, арыентаванне навучэнцаў на вучэбную дзейнасць, паслядоўнасць фарміравання самакантролю [1].

Сутнасць і напрамкі кампетэнтнаснага падыходу як вядучага ў сучаснай адукацыі абумовілі неабходнасць фарміравання асобы школьніка, здольнай супрацьстаяць знешнім негатыўным уздзеянням; абуджэнне асобаснага, суб'ектнага патэнцыялу навучэнца, які імкнецца да самаактуалізацыі і самарэалізацыі; пошук шляхоў, якімі можна дапамагчы паспяхова сацыялізавацца і адаптавацца да зменных умоў; стварэнне ўмоў для асобаснай самарэалізацыі і станаўлення суб'ектнасці навучэнца, фарміраванне яго фізічнага, псіхічнага і маральнага здароўя як гарантыі супрацьстаяння дэвіянтным паводзінам [8].

Наша цікавасць да рэгулятыўных дзеянняў абумоўлена іх прамой сувяззю з фарміраваннем адвольнага тыпу паводзін, прынцыпова важнага не толькі для паспяховай вучэбнай дзейнасці малодшага школьніка, але і для яго жыццядзейнасці цалкам. Як адзначана раней, малодшы школьны ўзрост характарызуецца псіхалагічнай гатоўнасцю да фарміравання волі і адвольнасці, што дае магчымасць мэтанакіравана і ўпарадкавана рэгуляваць дзейнасць і паводзіны. Воля праяўляецца ў пастаноўцы і захаванні мэты, ва ўменні праяўляць намаганні ў яе дасягненні, а адвольнасць прадугледжвае ўменні будаваць паводзіны па ўзоры і ажыццяўляць дзеянні планавання, кантролю і карэкцыі пры дапамозе адпаведных сродкаў. Пры ўмовах авалодання дадзенымі ўменнямі школьнік здольны паспяхова вучыцца, у тым ліку і самастойна.

Асаблівасці зместу і пабудовы метадычнага забеспячэння працэсу навучання беларускай мове ў кантэксце развіцця менавіта пералічаных вышэй рэгулятыўных універсальных дзеянняў:

- выбар тэкстаў для работы (тэксты маюць падкрэслена выхаваўчую скіраванасць, якая праяўляецца ў дэманстрацыі прыкладаў станоўчых паводзін, рыс характару, або спрыяюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці);
- змест заданняў, якія патрабуюць актывізацыі адвольнай формы паводзін і валявых праяў

(аналіз і сінтэз інфармацыі з некалькіх крыніц, пошук прычынна-выніковых сувязяў, прагназаванне памылак, у тым ліку ўласных, пошук дадатковых звестак, "мазгавы штурм", дэманстрацыя ўласнага вопыту і маральных нормаў і інш.);

- формы і спосабы выканання заданняў (пошук спосабаў дзеяння, будовы алгарытму рашэння вучэбна-практычнай задачы, заданні на трансфармацыю спосабаў прадстаўлення інфармацыі, пабудова звязнага выказвання і інш.).

Дадзеныя асаблівасці ўплываюць на ўсталяванне сувязяў паміж развіццём рэгулятыўных дзеянняў і станоўчых маральна-валявых якасцей навучэнцаў.

Найбольшую цяжкасць у навучэнцаў могуць выклікаць заданні, арыентаваныя на фарміраванне наступных уменняў:

- вызначэнне паслядоўнасці дзеянняў для дасягнення пастаўленай мэты;
- кантроль над уласнымі дзеяннямі;
- самастойны пошук невідавочнага спосабу выканання задання;
- абгрунтаванне ўласнага стаўлення да праблемы пры дапамозе інфармацыі з тэксту і па-за яго межамі;
- ацэнка вынікаў выканання заданняў.

Пазначаныя вышэй цяжкасці, з якімі, хутчэй за ўсё, сутыкнуцца навучэнцы, патрабуюць прэвентыўнай работы з боку педагога. Трэба заўважыць, што настаўнік будзе "змагацца" з комплексам цяжкасцей, якія абумоўлены складаным працэсам фарміравання і пазнавальных уменняў, і рэгулятыўных, і камунікатыўных. Гэта робіць арганізацыю адукацыйнага працэсу шматбаковай, сістэматычнай і індывідуальнай.

Такім чынам, працэс фарміравання ўніверсальных вучэбных дзеянняў становіцца эфектыўным, калі школьнік пачынае вучыцца для самаразвіцця. Педагог праводзіць сістэматычную, мэтанакіраваную работу па падтрымцы навучэнца, выкарыстоўваючы разнастайныя віды дапамогі: стымулюючую, эмацыянальную, рэгулюючую, навучальную і інш. Дасягненне школьнікам адукацыйных вынікаў становіцца магчымым, калі ў яго з'яўляюцца матывацыя і ўнутраная накіраванасць на поспех — пачынаецца працэс актыўнага мыслення.

Як бачым, дадзены аспект патрабуе мэтанакіраванай работы, таму што недастатковая сфарміраванасць адвольна-рэгулятарнай сферы навучэнца абавязкова цягне за сабой цяжкасці ў навучанні, якія патрабуюць дадатковай і вельмі складанай карэкцыі.

Асаблівасці метадычнага забеспячэння працэсу вывучэння беларускай мовы ў кантэксце развіцця рэгулятыўных універсальных дзеянняў (выбар тэкстаў для работы, зместу заданняў, формы і спосабаў іх выканання) уплываюць на ўсталяванне сувязяў паміж развіццём рэгулятыўных дзеянняў і фарміраваннем станоўчых маральна-валявых якасцей навучэнцаў.

*СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. Вареца, Е. С. Возможности формирования личностной саморегуляции младших школьников / Е. С. Вареца // Вестник Адыгейского государственного университета. — Серия 3 : Педагогика. Психология. — Выпуск 2 (159). — 2015. — С. 147—151.
2. Воровщиков, С. Г. Достоинства и недостатки перечня универсальных учебных действий Федерального государственного образовательного стандарта общего образования [Текст] / С. Г. Воровщиков // Эйдос : интернет-журн. — 2012. — № 5.
3. Кузнецова, О. В. Формирование регулятивных универсальных учебных действий младших школьников в процессе обучения : автореф. дис. ... канд. пед. наук / О. В. Кузнецова. — Ярославль, 2015.
4. Кямалзаде, Г. М. Динамика развития регулятивных универсальных учебных действий в начальных классах [Электронный ресурс] // Международный студенческий научный вестник. — 2014.— № 3. — Режим доступа: https://eduherald.ru/ru/article/view?id=11893. — Дата доступа: 13.01.2021.
5. Образовательный стандарт начального образования [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. — Дата доступа : 10.12.2020.
6. Росина, Л. Н. Формирование саморегуляции у младших школьников в процессе учебной деятельности : автореф. дис. ... канд. психол. наук / Л. Н. Росина. — Н. Новгород, 1998.
7. Скрябина, О. А. Психологические аспекты содержания понятия регулятивных учебных действий у младших школьников с трудностями в обучении [Электронный ресурс] / О. А. Скрябина. — Режим доступа: https://elib.pstu.ru/vufind/EdsRecord/edselr,edselr. — Дата доступа : 13.01.2021.
8. Социально-педагогическая профилактика : учеб.-метод. комплекс по учеб. дисциплине для специальности 1-03 04 01-02 Социальная педагогика. Воспитательная работа в образовательных учреждениях; 1-03 04 02-02 Социальная педагогика. Практическая психология [Электронный ресурс] / сост. Г. Ф. Бедулина, Е. К. Погодина. — Режим доступа : http://elib.bspu.by/handle/doc/197. — Дата доступа : 08.12.2020.
9. Хомчанка, В. Ф. Апельсін : апавяданні : для дзяцей мал. школьнага ўзросту ; уклад. А. Спрынчан ; іл. В. Макаранкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. — 31 с. — (Я люблю чытаць).